

# Аднасастаўныя сказы







# Яўгенія Янішчыц

*20.11.1948 – 25.11.1988*



# Аднасастаўныя сказы



**Міні-тэст.**

**Вызначце аднасастаўныя сказы.**

1. Дзяўчынцы хочацца ў паэты.

2. Хмурны дзень у чыстым полі.

3. Прыйшоў дадому позна.

4. Пастукалі ў дзверы.

# Тыпы аднасастаўных сказаў

| Назыўны | Пэўна-асабовы | Няпэўна-асабовы | Абагульнена-асабовы | Безасабовы |
|---|---|---|---|---|
| наз. у Н. с. | дз. 1 ці 2 асобы (я-мы, ты-вы) цяп. і буд. ч. ці загад. лад | дз. 3 асобы (яны) мн. лік, цяп., буд. і пр. ч. | прыказка афарызм | безасаб. дз. |
| Цішыня. І азёрная гладзь. | Сюды вяртаюся са скрух, з імжыстых суравеяў. | У хаце ціха заспявалі. | Сябра за грошы не купіш. | Так многа намяло на сцежку лісця. |

# ВЫРАЖЭННЕ ГАЛОЎНАГА ЧЛЕНА Ў БЕЗАСАБОВЫМ СКАЗЕ

| Спосаб выражэння | Прыклад |
|---|---|
| Безасабовы дзеяслоў (зваротны ці незваротны) | Мне нездаровіцца.<br>Улетку світае рана. |
| Зваротны дзеяслоў у безасабовым значэнні | Не спіцца.<br>Хочацца сустрэцца з табой. |
| Асабовы дзеяслоў у безасабовым значэнні (часта ў спалучэнні з інфінітывам) | З ракі цягне прахалодай.<br>Хутка пачне прыпякаць. |
| Прыслоўе са значэннем стану | На сэрцы радасна.<br>Сёння холадна.<br>У лесе ціха. |
| Дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу | У пакоі прыбрана.<br>У пакоі было прыбрана. |
| Адмоўнае слова няма (не было, не будзе) | Маёй вёскі больш няма. |
| Інфінітыў | Быць навальніцы! |

*Устанавіце адпаведнасць паміж відам аднасастаўнага сказа і яго нумарам. Адказ запішыце ў сшытак. Запоўніце табліцу.*

| Нумар сказа | Від аднасастаўнага сказа | Галоўны член сказа выражаны |
|---|---|---|
| 2 | А. Пэўна-асабовы | [redacted] |
| 4 | Б. Няпэўна-асабовы | [redacted] |
| 5 | В. Абагульнена-асабовы | [redacted] |
| 1 | Г. Безасабовы | [redacted] |
| 3 | Д. Назыўны | [redacted] |

1. **А самой вось не сядзіцца.**
2. **Прывязі, прашу, шыпшыны мне і мяты, гаварок палескі наш негаваркі.**
3. **Сіні вецер. Белы дзень.**
4. **Прынеслі пошту.**
5. **Новых сяброў нажывай, але і старых не забывай.**

**Канструктар**

Перабудуйце двухсастаўныя сказы ў аднасастаўныя безасабовыя. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

Мы адпачываем весела.

Моладзь верыць у будучае.

Я хачу вучыцца ва ўніверсітэце.

Ці ведаеце вы прыказкі?

Спалучыце правільна часткі прыказак.

Аднасастаўныя сказы якога віду атрымаліся?

Дакажыце гэта.

| | |
|---|---|
| Слова як птушка: | сваё гняздо бароніць. |
| Усякая птушка | не бойся нікога. |
| Як дбаеш, | вылеціць -- не зловіш. |
| Не рабі ліхога і | калі ў дзецях лад. |
| Нашто лепшы клад, | век вучыся. |
| Век жыві, | так і маеш. |

*Зрабіць сінтаксічны разбор сказа.*

*Благаслаўляю адчай і трывогу, медуніцу з сухім палыном.*



Мне па душы глухія пуш..ы
Лістоты замець на двар..  .
Я (не) прыручанаю птушка..
Жыву міх сполаха.. і дрэў.
Каторы дзень настрой губляю
І зноў (па) новаму люблю.
Б..гу гукаю выгл..даю
Шукаю думаю (не)сплю.
О, людзі!—Вечныя пытан..і,
Вытокі мудрасці і зла.
Нясу ў сваё св..тое ран..е
Любоў і гнеў на (паў)крыла.
Мяне ў палёце (не)скарылі.
А будзе што не так—малю
Скруціце стомленае крыл..е
І кіньце ў родную рал..ю.

“Дзень добры, маё дзіцятка. Надоечы брала каня. З тых пор, як схавалі мы бацьку, лагоднейшым стаў старшыня. Дзякуй богу, здарова. Грошай болей не шлі. Малако—ад сваёй каровы. Сала ёсць. Нашто мне рублі. Ёсць нейкая пенсія. Хопіць. Адной, колькі тое яды!

Унучак жа—слаўны хлопец, няма з ім ніякай бяды. Цалюткімі днямі—босы, паправіўся, загарэў. Глядзіш, і дзяцюк пад восень. Трэба паправіць хлеў. Шыферу заказала цэлых дзвесце лістоў. Яшчэ табе не сказала, што будзе многа грыбоў…

Цалуема моцна.Пішы.”

